Справа гонару кожнага камсамольца— паказаць узоры ўдарнай, самаадданай працы ў барацьбе за выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС, дабіцца ганаровага права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

*(З пастановы VI пленума ЦК ВЛКСМ).*

**Аб галоўных напрамках штодзённай работы камсамольцаў універсітэта чытайце на 2—3-й старонках.**

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (1147) ● 9 снежня 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

# НАВІНЫ

## ТВОЙ СЯБРА — ГАЗЕТА

З вялікай увагай адносяцца да насценнага друку на фізічным факультэце. Тут рэгулярна выходзіць газета «За навуку». Адказны сакратар — М. Шумейка. Газета заўжды цікава аформлена. Важнейшыя яе рубрыкі: «Партыйнае жыццё», «Студэнт і навука», «Спартыўныя навіны» і многія іншыя. У выпуску насценгазеты актыўна ўдзельнічаюць студэнты факультэта А. Цімашэнка (адказны за выпуск насценгазеты ад камітэта камсамола), Т. Нікіціна, С. Федарэнка, Т. Кудзіна, М. Грыбава. Дзейсным з'яўляецца і «Камсамольскі пражэктар» фізфака.

**В. ЧАРНУШЭНКА.**

## ЗА БЯСПЕКУ РУХУ

У мэтах павышэння ведання правілаў дарожнага руху і недапушчэння дарожна-транспартных здарэнняў у г. Мінску з 24 лістапада па 10 снежня ў БДУ праводзіцца кіналекторый. Ён прысвечан правілам бяспекі руху пешаходаў і аўтатранспарту на вуліцах горада і дарогах сельскай мясцовасці. У пачатку кожнага кінапаказу з лекцыямі выступаюць супрацоўнікі ДАІ УУС Мінгарвыканкома. Дэманструюцца дакументальныя стужкі «Секунда», «Імем закона...», «Спыніся, Марына» і іншыя.

Слухачы і гледачы кіналекторыя — студэнты і супрацоўнікі універсітэта.

## КАРЫСНАЯ СУСТРЭЧА

Студэнты І курса факультэта журналістыкі наведалі нядаўна Беларускае аддзяленне АДН (Агенцтва друку Навіны), дзе сустрэліся з былым выпускніком журфака, а зараз уласным карэспандэнтам Беларускага аддзялення АДН Ігарам Асінскім, які расказаў аб структуры Агенцтва, аб асаблівасцях работы карэспандэнтаў АДН, пазнаёміў з некаторымі матэрыяламі.

Сустрэча прайшла вельмі цікава.

**М. ХАЛІМОНЧЫКАЎ,**
**студэнт І курса журфака.**

*Партыйнае жыццё*

# ЭФЕКТ СУМЕСНЫХ НАМАГАННЯЎ

**30 ЛІСТАПАДА 1976 года прайшоў адкрыты партыйны сход партарганізацыі праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў (ПЛСД) і сектара прыкладной сацыялогіі БДУ. З дакладам выступіў намеснік загадчыка ПЛСД, кандыдат эканамічных навук А. СКРЫПЧАНКА. Ён падвёў вынікі работы калектыву лабараторыі і сектара прыкладной сацыялогіі, давёў да ведама камуністаў задачы парт-арганізацыі ў святле рашэнняў лістападаўскага (1976 г.) пленума ЦК КПБ. Вытрымкі з даклада прапануем увазе чытачоў.**

Навуковыя супрацоўнікі праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў і сектара прыкладной сацыялогіі ўнеслі свой уклад у скарбонку працоўных дасягненняў першага года дзесятай пяцігодкі. Супрацоўнікі выканалі шэраг распрацовак па актуальных праблемах. Так, **СЕКТАРАМ ПРАБЛЕМ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ** была працягнута работа па тэме «Шляхі фарміравання грамадска-палітычнай актыўнасці студэнцкай моладзі». Даследаванне вялося па напрамках:

— вывучэнне ролі грамадска-палітычнай практыкі ў павышэнні грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў;

— уплыў псіхалагічнага клімату акадэмічнай групы ВНУ і сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцей асобы на грамадска-палітычную актыўнасць студэнтаў.

Калектыў гэтага сектара зрабіў апытанне каля 2,5 тысячы студэнтаў І—IV курсаў чатырох ВНУ рэспублікі, падрыхтаваў і здаў у друк манаграфію «Студэнт і яго дзейнасць: сацыялагічнае даследаванне». Супрацоўнікамі сектара апублікавана 10 работ. Сумесна з кафедрай педагогікі БДУ ў гэтым годзе сектар правёў навуковую канферэнцыю, прысвечаную пытанням камуністычнага выхавання студэнтаў.

Добра папрацаваў і **СЕКТАР ПРАБЛЕМ САВЕЦКАЙ СЯМ'І** па тэме «Прычыны распаду сем'яў». Супрацоўнікі вывучалі ў нарсудах Мінска шлюбаразводную практыку за 1971—75 гг. На аснове атрыманай інфармацыі зроблены дакладныя запіскі з абгрунтаваннямі і прапановамі Міністэрству юстыцыі рэспублікі, Пракуратуры і Вярхоўнаму суду БССР.

У маі гэтага года сектар прыступіў да работы над тэмай «Сацыяльна - псіхалагічныя аспекты выхаваўчай функцыі сям'і». Многія навуковыя супрацоўнікі, асабліва А. Кузняцоў і А. Воднеў, праявілі вялікую актыўнасць, дзякуючы чаму асноўная частка работ на сённяшні дзень выканана.

Цяпер аб **СЕКТАРЫ ПРЫКЛАДНОЙ САЦЫЯЛОГІІ.** У 1976 г. супрацоўнікамі сектара выканана гаспадарча - дагаворных работ на суму 158 тысяч рублёў. Навукова-даследчая работа праводзілася на дзевяці прадпрыемствах у пяці гарадах рэспублікі. Напрыклад, для Магілёўскага завода «Строммашына» супрацоўнікамі распрацаваны рабочыя праграмы даследавання маральнага і матэрыяльнага заахвочвання работнікаў, працэсу прафесійнай адаптацыі маладых рабочых. Была праведзена атэстацыя дзелавых і маральных якасцей 112 майстроў, даследавана сістэма матэрыяльнага і маральнага стымулявання работнікаў прадпрыемства, сістэма грамадскага самакіравання і стан працоўнай дысцыпліны ў вытворчым калектыве. Усяго было апытана каля 5000 чалавек.

Групы сацыёлагаў добра папрацавалі на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя С. М. Кірава, Аршанскім льнокамбінаце. У Баранавічах, Вілейцы, Любані былі праведзены канферэнцыі па тэме «Актуальныя пытанні ідэйна-маральнага выхавання працоўных».

Усяго супрацоўнікамі сектара прыкладной сацыялогіі ў 1976 г. распрацавана 2 методыкі сацыялагічных даследаванняў, напісана 20 аналітычных запісак, надрукавана і падрыхтавана да друку каля 20 работ, распрацавана 7 рабочых праграм даследаванняў. Супрацоўнікі сектара 6 разоў выступалі па радыё і тэлебачанню, больш 30 разоў удзельнічалі ва ўсесаюзных, рэспубліканскіх і гарадскіх канферэнцыях, семінарах, нарадах.

На рашэнне надзённых задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС, непасрэдна накіраваны даследаванні **СЕКТАРА САЦЫЯЛОГІІ ПРАЦЫ.** У 1976 годзе сектар правёў аналіз механізацыі і аўтаматызацыі вытворчасці; укаранення новай тэхнікі і яе эканамічнай эфектыўнасці; стану навуковай арганізацыі працы, рацыяналізацыі і вынаходніцтва, тэхнічнага нарміравання і выканання норм выпрацоўкі; выкарыстання працоўнага часу і г. д. Шляхам дэталёвага аналізу выяўлены асноўныя прычыны страт працоўнага часу.

Вялікая работа выконвалася ў гэтым годзе **СЕКТАРАМ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ.** Даследаванні праводзіліся сумесна з Гродзенскім абкомам КПБ. Сектарам падрыхтаван макет Комплекснага плана эканамічнага выхавання працоўных, які зараз разглядаецца ў цэнтральных органах рэспублікі і ў хуткім часе будзе накіраван прадпрыемствам БССР. Загадчыкам сектара распрацавана Комплексная праграма ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі на ўвесь перыяд навучання, якая атрымала адабрэнне ў многіх ВНУ БССР.

У стадыі эксперыменту знаходзіцца варыянт асабістага творчага плана прапагандыста, распрацаваны ст. навуковым супрацоўнікам К. Шульгой. Апрабацыя гэтай распрацоўкі праводзіцца ў многіх партыйных камітэтах рэспублікі.

Сектарам сумесна з Вілейскім райкомам КПБ праведзена канферэнцыя «Комплексны падыход у ідэйна-выхаваўчай рабоце».

На лістападаўскім (1976 г.) пленуме ЦК КПБ першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў сказаў: «Неабходна... на практыцы забяспечыць аб'яднанне намаганняў навукі і вытворчасці ў імя павышэння эфектыўнасці нашай эканомікі». Вось чаму ў 1977 годзе перад калектывам праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў і сектарам прыкладной сацыялогіі стаяць вялікія і адказныя задачы.

Супрацоўнікі сектара праблем студэнцкай моладзі павінны абагульніць вынікі ўжо зробленых даследаванняў, напісаць навуковую справаздачу. Прадугледжваецца напісанне манаграфіі «Грамадска-палітычная актыўнасць студэнтаў».

Сектар сям'і плануе распрацоўку праграмы і інструментарыя па тэме «Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты выхаваўчай функцыі сям'і». У той жа час будуць завершаны даследаванні па тэме «Умовы стабільнасці і прычыны распаду сем'яў».

Сектар эфектыўнасці ідэалагічнай работы ў 1977 годзе завяршае распрацоўку дзвюх тэм: «Фарміраванне навуковага светапогляду слухачоў сістэмы партыйнай адукацыі» і «Фарміраванне разумных патрэб слухачоў сістэмы партыйнай адукацыі».

Калектыў сектара сацыялогіі працы прадоўжыць работы па праблеме—даследаванне змен характару і зместу працы; устанаўленне ролі і месца сацыялогіі працы ў структуры марксісцкай сацыялагічнай тэорыі; вывучэнне напрамкаў змен зместу працы ва ўмовах НТР.

У сектары прыкладной сацыялогіі мяркуецца працягваць даследаванні па ўзнятых праблемах, запланавана напісаць шэраг навуковых артыкулаў, правесці ўсесаюзныя канферэнцыі ў Оршы і Брэсце, зрабіць 5 анкетных апытанняў і г. д.

Планы ПЛСД аб'ёмістыя. Трэба прызнаць, што плённая работа лабараторыі была б немагчымай без сумесных намаганняў і цеснага супрацоўніцтва сектараў, работы партарганізацыі па каардынацыі работы супрацоўнікаў, мабілізацыі іх на выкананне планавых заданняў, актывізацыі работы камітэта камсамола і мясцкома ПЛСД. У калектыве значна палепшыўся стан працоўнай і вытворчай дысцыпліны. Але надзённым усё ж застаецца пытанне культуры, паводзін супрацоўнікаў лабараторыі.

Зыходзячы з рашэнняў лістападаўскага (1976 г.) пленума ЦК КПБ, нам трэба ўмацаваць сувязі з прамысловасцю. Мы павінны яшчэ і яшчэ раз перагледзець свае планы, функцыянальныя абавязкі. У бліжэйшы час трэба рашыць пытанне аб кадрах у адносінах да тых падраздзяленняў нашай лабараторыі, якія працуюць на прамысловасць.

# КРАІНА ЦУДОЎНАЙ ПРЫРОДЫ І ЦУДОЎНЫХ ЛЮДЗЕЙ

З 1 верасня па 1 кастрычніка група студэнтаў геаграфічнага факультэта праходзіла вытворча-азнаямленчую практыку у Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспубліцы Югаславіі.

Першым прыродным раёнам, які наведала наша група, былі Альпы. Мы ўбачылі грандыёзныя прыродныя ўтварэнні — вадапады, леднікі, міжгорныя азёры. Аднак Альпы славяцца не толькі гэтым. У перыяд другой сусветнай вайны тут былі жорсткія баі паміж абаронцамі сваёй радзімы — югаслаўскімі партызанамі — і гітлераўскімі захопнікамі, аб чым сведчаць шматлікія помнікі.

Далей наш шлях ляжаў на плато Карст, у г. Пастойна. Асабліва ўразіла нас пячора Пастойна Яма, якая знаходзіцца непадалёку ад горада і з'яўляецца галоўным аб'ектам турыстаў. Яна славіцца самымі разнастайнымі сталагмітамі і сталактытамі, вялізнымі заламі, падземнымі рэкамі і азёрамі.






Мы пазнаёміліся і з іншымі пячорамі плато Карст. Адбылося ўзыходжанне на карставы масіў Нанос.

Наша практыка не абмежавалася аднымі экскурсіямі. У нас былі сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі філасофскага факультэта, геаграфічнага аддзялення Люблянскага універсітэта. Хочацца адзначыць выключную гасціннасць, ветлівасць, дружалюбнасць югаслаўскіх сяброў.

**С. КЛЁСАЎ,**
**студэнт IV курса геафака.**




**Менш года засталося да юбілею — 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Увесь савецкі народ рыхтуецца сустрэць гэты юбілей новымі працоўнымі перамогамі. Разам з усім народам удзельнічае ў гэтым руху і савецкая моладзь. На V пленуме ЦК ВЛКСМ было прынята рашэнне аб арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва камсамольцаў за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Лепшыя з лепшых атрымаюць ганаровае права сфатаграфавацца ля легендарнага крэйсера «Аўрора».**

**Камсамольская арганізацыя універсітэта актыўна ўключылася ў гэтае спаборніцтва. На пасяджэнні бюро камітэта камсамола было разгледжана пытанне аб разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва за права падпісання Рапарта Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Было распрацавана і зацверджана палажэнне аб гэтым сацыялістычным спаборніцтве, якое праходзіць у чатыры этапы. Першы этап скончыўся ў кастрычніку гэтага года. Другі этап заканчваецца 22 красавіка**

# ВЫЗНАЧЫЦЬ ЛЕПШЫХ

**1977 года. Трэці этап будзе праходзіць з 22 красавіка 1977 года па 25 чэрвеня 1977 года. Чацвёрты, завяршаючы этап — з 25 чэрвеня па 29 кастрычніка 1977 года. У канцы кожнага прамежкавага перыяду на камсамольскіх сходах груп падводзяцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, вызначаецца пераможца. Яго прозвішча заносіцца ў спецыяльны мандат. У канцы апошняга, чацвёртага этапа, вызначаецца пераможца сацыялістычнага спаборніцтва за ўвесь перыяд. Для пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва за права падпісання Рапарта Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка ў камітэце камсамола універсітэта будзе праведзен прыём, на якім адбудзецца падпісанне Рапарта.**

**Поспех сацыялістычнага спаборніцтва залежыць ад таго, як аператыўна ў камсамольскіх арганізацыях факультэтаў падвядуць вынікі і вызначаць пераможцаў, як будзе забяспечана галоснасць і параўнальнасць рэзультатаў, як у цэлым яно будзе арганізавана. Неабходна стварыць умовы для распаўсюджвання вопыту і ініцыятывы перадавікоў сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба мець на ўвазе, што гэтае спаборніцтва—індывідуальнага характару, і таму падвядзенне вынікаў уключае ў сябе не толькі вызначэнне пераможцы, але і ацэнку камсамольскай групай поспехаў кожнага.**

**Гэта сацыялістычнае спаборніцтва цесна звязана з калектыўным сацыялістычным спаборніцтвам акадэмічных груп, праходзячым пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!». Вызначэнне лепшых, ацэнка поспехаў кожнага — палова справы. Дапамога адстаючым таксама павінна быць у цэнтры ўвагі. Такая пастаноўка работы дазволіць правесці сацыялістычнае спаборніцтва на належным узроўні.**

**На сённяшні дзень у камсамольскай арганізацыі універсітэта падведзены вынікі першага этапа сацыялістычнага спаборніцтва за права падпісання Рапарта Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Можна ўжо падвесці некаторыя вынікі. Добра было арганізавана падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва ў камсамольскіх арганізацыях факультэта журналістыкі, гістарычнага і іншых. У гэтых арганізацыях на камсамольскіх сходах была дадзена ацэнка работы кожнаму камсамольцу, адзначаны поспехі, прааналізаваны недахопы, забяспечана галоснасць. Але, на жаль, у рабоце асобных камсамольскіх арганізацый па разгортванню сацыялістычнага спаборніцтва маюцца недахопы. Так, у камсамольскай арганізацыі біялагічнага факультэта асобныя камсоргі дрэнна ўяўляюць мэты і задачы сацыялістычнага спаборніцтва, якое праводзіцца. У камсамольскай арганізацыі фізічнага факультэта некаторыя камсамольцы не ведаюць нічога аб пераможцах сваёй групы. Гэта гаворыць аб фармалізме ў арганізацыі спаборніцтва. Нездавальняюча яшчэ рашаецца ў асобных камсамольскіх арганізацыях пытанне аб галоснасці сацыялістычнага спаборніцтва.**

**У бліжэйшыя дні камітэтам камсамола факультэта неабходна ўважліва прааналізаваць вынікі першага этапа і арганізацыю ходу сацыялістычнага спаборніцтва за права падпісання Рапарта Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.**

**Г. ХУХЛЫНДЗІН,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ.**



Цікавы артыкул. Фота А. Шарава.

## *За авалоданне прафесіяй*

# ЯК ПАТРАБУЕ

«Савецкі журналіст павінен спалучаць у сабе высокія ідэйна-маральныя якасці і прафесійнае майстэрства, быць актыўным правадніком палітыкі партыі».

Гэтыя радкі з пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» вызначаюць галоўны напрамак усёй работы камсамольскай арганізацыі журфака.

Мы вучымся на творчым факультэце. Ужо два гады абітурыенты, паступаючыя да нас, перад уступнымі экзаменамі ўдзельнічаюць у творчым конкурсе. У гэтым годзе на конкурс было прадстаўлена 1537 публікацый. Гэта гаворыць аб тым, што да нас прыходзяць у асноўным тыя юнакі і дзяўчаты, якія супрацоўнічалі раней з рэдакцыямі газет, часопісаў, радыё і тэлебачання. Яны ўжо ў нейкай меры знаёмы з нялёгкай прафесіяй журналіста.

Паступіўшы ва універсітэт, былыя рабкоры, селькоры, ваенкоры і юнкоры з дапамогай выкладчыкаў, старшакурснікаў рыхтуюцца стаць сапраўднымі журналістамі, байцамі ідэалагічнага фронту. Мы ганарымся, што матэрыялы студэнтаў нашага факультэта друкуюць рэспубліканскія і цэнтральныя газеты і часопісы.

XXV з'езд падкрэсліў, што жыццё прад'яўляе да камсамола ўсё больш і больш высокія патрабаванні, дыктуе неабходнасць далейшага ўзмацнення камуністычнага выхавання моладзі, дасканалення стылю, форм і метадаў яго працы, яшчэ больш актыўнага і свядомага ўдзелу маладых людзей у камуністычным будаўніцтве.

І нам, будучым работнікам друку, радыё і тэлебачання, перш за ўсё выконваць гэтыя задачы.

Таму камсамольская арганізацыя факультэта журналістыкі сваю работу накіроўвае на аказанне дапамогі прафесарска-выкладчыцкаму саставу, дэканату і партыйнаму бюро ў падрыхтоўцы спецыялістаў высокай кваліфікацыі. Разам з тым камітэт камсамола пастаянна адчувае дапамогу і падтрымку з боку дэканата і партбюро. На пасяджэннях камітэта часта прысутнічаюць дэкан факультэта прафесар Р. Булацкі, сакратар партбюро С. Говін, намеснік дэкана дацэнт А. Раковіч. Актыўную дапамогу ў нашай працы аказваюць камуністы М. Цікоцкі, Б. Стральцоў, В. Пыжкоў, М. Сілуянаў, Г. Жураўлёў, Е. Бондарава, Т. Арлова, А. Слука, А. Плаўнік і іншыя.

Уся наша праца ў мінулым навучальным годзе была накіравана на дастойную сустрэчу XXV з'езда КПСС і выкананне яго рашэнняў. Напярэдадні партыйнага з'езда ва ўсіх камсамольскіх групах было разгорнута спаборніцтва за права падпісання Рапарта Ленінскага камсамола XXV з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Спаборнічалі не толькі камсамольцы ў групах, але і цэлыя групы. Рапарт падпісалі Ф. Бародкіна, А. Уліцёнак, Т. Нічыпарук, Е. Міраноўская, А. Андрэеў, А. Астроўскі і іншыя.

Дастойным падарункам партыйнаму з'езду ад студэнтаў журфака з'явілася пасяховая здача зімовай экзаменацыйнай сесіі. Па яе выніках факультэт заняў трэцяе месца ва універсітэце.

Летняя сесія прайшла пад дэвізам універсітэцкай камсамоліі «Ніводнага адстаючага побач!» і зноў мы занялі трэцяе месца па паспяховасці. З 367 камсамольцаў 36 атрымалі толькі выдатна, 210 — добра і выдатна. Лепшай акадэмічнай групай стала трэцяя група цяперашняга другога курса (камсорг В. Станкевіч). Сярэдні бал гэтай групы — 4,3. Сярэдні бал камсамольскага актыву факультэта склаў 4,24, сярэдні бал камсоргаў — 4,43.

Сёння гонар нашага факультэта падтрымліваюць выдатнікі вучобы Л. Бадакова, С. Берасцень, В. Кадушка, Л. Лабачэўская, А. Астроўскі, Н. Пятроўская, Т. Скібіцкая, С. Герасімава, І. Драгайцава, В. Вараб'ёў, І. Александровіч, Н. Косарава, С. Новікаў, А. Уліцёнак, Г. Хвесь, С. Шастапалава.

Добрай традыцыяй сталі ў нас Ленінскія ўрокі і ўрокі мужнасці, сустрэчы з ветэранамі партыі і камсамола, вядомымі журналістамі, пісьменнікамі, дзеячамі навукі і культуры. У справе ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў вялікае значэнне маюць сустрэчы-гутаркі з выкладчыкамі і супрацоўнікамі факультэта — удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, наведванне памятных месц, музеяў. Камсамольцы факультэта збіраюць матэрыялы пра журналістаў, удастоеных звання Героя Савецкага Саюза. Тут мы выкарыстоўваем метад маральнага выхавання — выхаванне на жывых прыкладах.

Добрасумленна працуюць нашы студэнты на камуністычных суботніках і сельгасработах. Гэтай восенню яны сабралі каля 6 тысяч тон бульбы з плошчы 406 гектараў. Акрамя таго, яны правялі вялікую грамадска-па-

# ШУКАЦЬ НОВЫЯ МЕТАДЫ

Пасля справаздачна-выбарнай канферэнцыі ФПМ, якая праходзіла ў першых чыслах лістапада, на чале шматлікай камсамольскай арганізацыі факультэта стаў новы сакратар Васіль **Гарус.** Мы сустрэліся з ім праз месяц пасля гэтай падзеі. З пытання **ці прыходзілася Васілю і раней так блізка сутыкацца з камсамольскай работай** пачалі нашу размову.



— Так, я ўжо не навічок, стаж камсамольскай работы можна лічыць гадамі. Яшчэ ў школе быў сакратаром камітэта камсамола. Потым — армія. Вопыт узбагаціўся, калі я быў камсоргам роты, у камітэце камсамола батальёна. Але там было лягчэй. Усё ж такі розніца ў рабоце існуе, і немалая.

**— У чым жа менавіта, па-вашаму, яна заключаецца?**

— Па-першае, канешне, у маштабнасці. І ў школе, і на службе прыходзілася мець справы ў асноўным з невялікай колькасцю людзей, а тут — цэлы факультэт. І потым, у арміі ўсё падначалена дысцыпліне, загаду. Там не прыходзілася кагосьці пераконваць, напамінаць аб даручанай справе. А студэнты—заўсёды заняты народ. Адчуваю, што трэба і самому шукаць новыя метады работы. У гэтым мне ў многім дапамагае былы сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта, член камітэта камсамола Павел Гаранін. І яшчэ заўважыў вельмі важную розніцу — больш высокі ідэйны і агульнаадукацыйны ўзровень ведаў камсамольцаў - студэнтаў, на які неабходна арыентавацца ў нашай рабоце.

**— На чыю ж дапамогу ў пераадоленні ўсіх гэтых цяжкасцей вы можаце разлічваць?**

— У асноўным на дапамогу партарганізацыі. І дапамога гэта дзейсная. Напрыклад, нядаўна члены партбюро дапамаглі нам у арганізацыі на факультэце агляду мастацкай самадзейнасці.

**— Ну, а былы састаў камітэта камсамола?**

— Былы... Ён іменна «былы». Члены яго фактычна адмежаваліся. Здалі свае справы... і забылі, што яны калісьці былі членамі камітэта камсамола, забылі, што іх вопыт цяпер вельмі патрэбны новаму саставу. Быццам самі калісьці не пачыналі. Праўда, у камітэце застаўся Павел Гаранін. Ён надзейна ўзяў у свае рукі работу з першакурснікамі.

**— У новага састава камітэта камсамола ёсць цяпер невялікі, але стаж, свае першыя дасягненні. Можаце вы ўжо чым-небудзь пахваліцца?**

— Аб вялікіх поспехах пакуль гаварыць не будзем, ды і рана яшчэ. Аднак нешта ўжо ёсць. Пачатак у нас усё ж-такі не пасіўны. Самая значная падзея мінулага месяца — Дні студэнцтва Мінскай вобласці. Камітэт камсамола прыняў удзел у арганізацыі Дзён працы на факультэце. Каля 200 чалавек працавалі ў будаўнічым упраўленні № 21 і атрымалі добрыя водгукі. Паступова наладжваецца шэфская работа. Нядаўна нашы студэнты выступілі з канцэртам у ПТВ № 76 электронікі, а факультэцкая агітбрыгада дала канцэрт у інтэрнаце завода «Інтэграл».

**— Якія ж планы камітэта на будучыню? У чым ён бачыць сваю першачарговую задачу?**

— Работа прадстаіць вялікая. На факультэце ў мінулым навучальным годзе прыкметна прыціхла спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач!». На парадку дня галоўнай задачай стаіць пытанне аб узнаўленні і шырокім разгортванні гэтага дзейснага фактара ў павышэнні паспяховасці. Да таго ж, пачынаецца падрыхтоўка да трэцяга працоўнага семестра. Зараз мы фарміруем зімовы будаўнічы атрад, які будзе працаваць у г. Маладзечна. На час кароткіх зімовых канікул сфарміраваць паўнацэнны, працаздольны атрад — задача не з лёгкіх. Спраў, як бачыце, хапае...

**— А што вы можаце сказаць аб сваіх уласных задачах у камсамольскай рабоце?**

— Задачы ўсёй арганізацыі, задачы камітэта — гэта і мае задачы. Але мне яшчэ хацелася б удзяліць больш увагі павышэнню грамадскай актыўнасці студэнтаў факультэта. Грамадская работа выхоўвае ў чалавека пачуццё абавязку, пачуццё адказнасці. А камітэт камсамола меў бы магчымасць «зазірнуць у твар» амаль кожнаму студэнту. Бо даходзіць да кожнага, ведаць кожнага — адно з важнейшых патрабаванняў камсамольскай работы.

Інтэрв'ю правяла
Л. БАРАНАВА.

# ЧАС



літычную работу ў Бярэзінскім раёне Мінскай вобласці і Слаўгарадскім раёне Магілёўскай вобласці.

Арганізавана прайшоў у нас абмен камсамольскіх дакументаў. Падрыхтоўка і сам яго ход пастаянна знаходзіліся ў полі зроку і кантраляваліся партбюро.

Камітэт камсамола працуе ў цесным кантакце з прафсаюзным бюро факультэта. Мы праводзім сумесныя пасяджэнні, прымаем адзіныя планы работы. Гэта дапамагае нам больш аператыўна вырашаць некаторыя складаныя пытанні.

Кожны трэці студэнт журфака — член студэнцкага навуковага таварыства. У рабоце нашых навуковых канферэнцый прымаюць удзел студэнты з Масквы, Кіева, Казані, Львова. З навуковымі дакладамі нашы студэнты выступаюць і ў іншых гарадах краіны.

На факультэце стала правілам, што студэнцкія навуковыя гурткі з'яўляюцца ініцыятарамі дыспутаў, цікавых сустрэч, творчых дыскусій.

Наш калектыў мастацкай самадзейнасці па праву лічыцца адным з лепшых ва універсітэце.

Нядрэнных поспехаў дабіваюцца камсамольцы журфака і ў спорце.

Дні студэнтаў Мінскай вобласці, якія скончыліся нядаўна, з'явіліся сапраўдным аглядам камсамольскай арганізацыі факультэта. У гэтыя дні нашы студэнты ўдарна працавалі на будаўнічых аб'ектах Мінска, выступілі з лекцыямі і далі канцэрт мастацкай самадзейнасці для настаўнікаў і школьнікаў падшэфнай Грыцэвіцкай школы Клецкага раёна Мінскай вобласці, сустрэліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, прынялі ўдзел ва універсітэцкай навуковай студэнцкай канферэнцыі, здавалі нормы ГПА.

Але ў нашай працы ёсць і недахопы. Яшчэ не ўсе актывісты працуюць па-сапраўднаму адказна, з душой. Яшчэ нярэдка прыходзіцца нам сутыкацца з пасіўнасцю і абыякавасцю асобных камсамольцаў. Не зжыты выпадкі парушэнняў дысцыпліны. Камітэт камсамола працуе над выкараненнем гэтых недахопаў.

Сёння камсамольцы факультэта журналістыкі, уключыўшыся ў спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола Цэнтральнаму Камітэту КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, імкнуцца сустрэць юбілей Савецкай улады з яшчэ большымі поспехамі ў вучобе, у творчай і грамадскай актыўнасці.

**У. ГРЫНЯК,**
**сакратар камітэта камсамола факультэта журналістыкі, ленінскі стыпендыят.**

*Школа камсамольскага актыву*

# КАМСОРГІ ВУЧАЦЦА

— Назаві асноўныя правілы і дакументы ўліку членаў ВЛКСМ. У які тэрмін павінен стаць на камсамольскі ўлік член ВЛКСМ, калі ён перайшоў з адной установы ў другую?

На пытанні старшыні школы камсамольскага актыву хімічнага факультэта Любові Міхайлавай адказвае камсорг 6-й групы першага курса Ірына Лазарэнка. Голас гучыць цвёрда, упэўнена, адказ яе змястоўны, абгрунтаваны.

Пётр Грaковіч, камсорг 1-й групы другога курса, спыніўся на асноўных задачах камсамольскага ўліку, яго значэнні. Адказ юнака перарастае ў справаздачу аб камсамольскіх справах групы, аб тым, чым жывуць студэнты.

Мы прысутнічаем на атэстацыі камсамольскіх важакоў груп хімічнага факультэта па тэме «Статут ВЛКСМ — аснова камсамольскага жыцця». Юнакі і дзяўчаты прымаюць актыўны ўдзел у размове дапаўняюць адзін аднаго, задаюць дадатковыя пытанні адказваючым. Паступова гутарка набывае форму дыспуту.

— Школа камсамольскага актыву на факультэце працуе ўжо другі год, — расказвае сакратар камітэта камсамола Аляксандр Скарапанаў. — Справа ў тым, што многія камсоргі амаль не маюць практычных навыкаў штодзённай камсамольскай работы. Як правесці камсамольскі сход, паставіць на ўлік члена ВЛКСМ, правільна сабраць узносы — гэтыя пытанні складаюць асноўны напрамак нашых заняткаў. Акрамя гэтага, вывучаем прамову У. І. Леніна на III з'ездзе РЛКСМ, рашэнні пленумаў ЦК ВЛКСМ, праводзім інструктажы камсоргаў напярэдадні таго ці іншага мерапрыемства. Цікава праходзіць абмен вопытам работы камсоргаў лепшых камсамольскіх груп.

— Наогул, — працягвае Аляксандр, — школа дала свае вынікі: камсамольскія важакі пачалі працаваць больш арганізавана, цікавейшым стала жыццё ў групах, больш змястоўнымі — сходы.

У школе камсамольскага актыву факультэта займаецца 40 юнакоў і дзяўчат. Пасяджэнні праводзяцца два разы ў месяц. Кіруе ёю загадчык сектара ўнутрысаюзнай работы камітэта камсамола, старшы інжынер кафедры фізічнай хіміі Л. Міхайлава. Дапамагаюць ёй у падрыхтоўцы і правядзенні заняткаў усе члены камітэта камсамола, камсоргі груп супрацоўнікаў факультэта. Самыя актыўныя памочнікі — студэнты II курса Ірына Ткачук і Алег Ягораў.

Зараз рыхтуецца новае пасяджэнне школы камсамольскага актыву. У наступны раз будзе абмеркавана пытанне аб парадку вядзення дакументацыі, задачах і метадах работы ў групах і на патоках факультэта.

**А. ЖУРАВА,**
**Н. ЗЛЫДЗЕНКА.**

*Мы—шэфы*

# НАДЗЕЙНЫЯ СЯБРЫ

У шэфскім сектары камітэта камсамола гістарычнага факультэта працуе два чалавекі: Ніла Валнушкіна і Валянціна Трушко. Іх работа як бы дзеліцца на дзве часткі: падшэфныя школы і домакіраўніцтва. Але ніякай пэўнай граніцы паміж імі не існуе. Дзяўчаты займаюцца работай разам, дапамагаюць адна адной, раяцца.

На кожным курсе створаны спецыяльныя педатрады, якія выконваюць пэўныя функцыі: чытаюць лекцыі, наведваюцца ў падшэфныя школы, ГПТВ. Такіх атрадаў на факультэце дзевяць.

Студэнты заўсёды жаданыя госці ў падшэфнай Дабрынеўскай школе Дзяржынскага раёна. У школе прачытана некалькі лекцый аб універсітэце, аб камсамольскіх будоўлях. Педатрад III курса на чале з камандзірам Ліліяй Яскевіч афармляе стэнды для падшэфных, збірае для іх бібліятэку. Школа гэта адной з першых у раёне перайшла на кабінетную сістэму навучання, і сектар плануе аформіць там кабінет гісторыі.

У ГПТВ-34 чыгуначнікаў шэфы прачыталі шэраг лекцый, рыхтуецца выступіць там і факультэцкая агітбрыгада.

Дзяўчаты-другакурсніцы дзяжураць у падшэфным домакіраўніцтве, праводзяць гутаркі з дзецьмі. Працуюць з энтузіязмам, з натхненнем.

Сумесна са студэнтамі юрыдычнага факультэта праводзіцца работа з цяжкавыхоўваемымі. Рэгулярна адбываецца вучоба актыву. Лепшыя шэфы-актывісты: Зоя Берняковіч, Люда Кабылянец, Слава Швед, Ала Кальгаўчук і многія іншыя. У плане работы шэфскага сектара шмат пунктаў. Нямала яшчэ прыйдзецца папрацаваць дзяўчатам, каб іх падшэфным жылося весялей і цікавей, каб яны ведалі, што студэнты—іх надзейныя памочнікі і сябры.

**Р. ПЯТРОВІЧ,**
**студэнтка II курса журфака.**





**НА ЗДЫМКАХ:** абмеркаванне вынікаў падпіскі. Член камітэта камсамола ФПМ Мікалай ГУБАНАЎ і член прафкома Васіль ПАЛУЯН.

Таццяна ПРАЖОГА, Ірына КАЛЯГІНА і Святлана БОЙКІНА за выпускам чарговага нумара насценгазеты.

Фота А. Басава.

*Раскажу пра таварыша*

# РЫТМ ЖЫЦЦЯ

Цікавіцца гісторыяй Анатоль Разанаў пачаў яшчэ ў школе. Гэтая цікавасць і акрэсліла, дапамагла выбраць яму будучую прафесію — прафесію гісторыка.

Зараз Анатоль вучыцца на IV курсе, ён намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта па ідэалагічнай рабоце. Шмат абавязкаў у камсамольскага актывіста, але такі ўжо рытм жыцця будучага гісторыка: паспяваць і ў вучобе, і ў грамадскай рабоце. І ў тым, што на гістарычным факультэце з поспехам прайшлі «Дні працы» і «Дні памяці герояў», вялікая заслуга Толі.

Вопыт ён мае немалы: на першым курсе — камсорг групы, потым — курса, да апошняга часу — намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце.

Другі год ён у саставе СБА працуе на студэнцкіх будоўлях, мінулым летам Толя працаваў на БАМе. Шмат пабачыў, многае запомнілася за паўтара месяца: пабывалі будатрадаўцы на вугальных разрэзах у Нерунгры, далі некалькі канцэртаў у Залацінцы.

А восенню, у верасні, ён ездзіў на азнаямленчую практыку ў Іенскі універсітэт. Пазнаёміўся з гістарычнымі помнікамі Веймара, Дрэздэна, Эйзенаха, Кале, сустракаўся з моладдзю ГДР.

Размову пра актывіста мне хочацца закончыць пажаданнем Толю выдатных поспехаў у вучобе, у яго кіпучай камсамольскай дзейнасці.

**П. РАМАНЧУК.**

*Рэха трэцяга семестра*

# КАРЫСЦЬ: ПРАЦОЎНАЯ ЗАГАРТОЎКА

Гэты вечар на філфаку быў некалькі незвычайны. Студэнты адзначалі юбілей СБА факультэта. Святочны шумок, жарты, вылінялыя ад сонца і дажджу штармоўкі, вясёлыя твары. Сабраліся разам «ветэраны» і навічкі. Тыя, што даўно скончылі філалагічны факультэт, прыйшлі сюды, каб падзяліцца ўспамінамі і вопытам работы ў СБА.

Камандзір «Буравесніка» М. Прыгодзіч рапартуе аб выніках работы. Потым, па традыцыі, дэкану факультэта быў уручан каравай, які на гэты раз упрыгожвала лічба «10».

Дзесяць год і «Буравесніку», дзесяць слаўных, працоўных і незабыўных год. Нямала студэнтаў-філолагаў прайшло ў ім за гэты час працоўную загартоўку і выдатную школу сяброўства. Але як працаваў і чым вызначыўся ў гэтым годзе старэйшы на філфаку будатрад? На гэтым вечары будатрадаўцы падводзілі вынікі работы і ўспаміналі лета.

**Час дзеяння:** ліпень 1976 года.

**Адрас:** Палессе, Кастрычніцкі раён, в. Буда.

**Састаў** атрада пераважна мужчынскі. З трыццаці байцоў — толькі чатыры дзяўчыны. Таму і знаходзіліся яны ў «прывілеяваным становішчы»: рыхтавалі ежу для тых, хто кожны дзень быў «на пярэднім краі». Атрымлівалася, кажуць, вельмі добра!

У атрадзе сабраліся студэнты з розных курсаў і аддзяленняў. Аднак гэта не перашкодзіла ім хутка і моцна пасябраваць. Не дзіўна: усе прыехалі рабіць адну справу. Цікавыя людзі ў «Буравесніку». Ёсць паэты, музыканты, нават, як высветлілася, нядрэнныя артысты. Віця Шклянік, напрыклад. Хто б мог падумаць, што ў гэтым сціплым юнаку столькі гумару, знаходлівасці, артыстычнасці. Як добра ён сыграў Няптуна на атрадным свяце!

Аляксандр Мячай — «ветэран» атрада. Чатыры гады выязджае ён на меліярацыю.

**Настрой:** самы лепшы і, галоўнае, — працоўны. Ехалі ў Буду другі раз. Цікава было сустрэцца са старымі знаёмымі.

**Работа,** зразумела, — галоўнае. Гэта ўмацаванне асушальных каналаў. Атрад падзялілі на тры брыгады. Кожная з іх мела сваю «спецыялізацыю». Калабоі выконвалі самую цяжкую работу: забівалі на беразе канала калы. У іх брыгаду адбіраліся самыя моцныя, таму, напэўна, і назвалі яны сябе «гладыятарамі». Быў у іх свой «Спартак» — майстар калабояў Н. Ярашэвіч. За імі ішлі прысыпшчыкі: яны мацавалі фашыны — звязкі з некалькіх бярозавых ствалоў. На фашыны накладваўся дзёран. Гэтую заключную аперацыю выконвалі дзёрнарэзы. Так умацоўваліся берагі канала. Працавалі байцы дружна, зладжана.

**Кароткі перапынак:** на ўтульнай палянцы байцоў чакае абед. Яго заўсёды прывозяць у поле, бо так зручней: не трэба на доўгі час адрываць байцоў ад працы. І наогул, на свежым паветры...

**Вольны час** не раз'ядноўваў атрад, бо думаць, як яго правесці, не прыходзілася: спраў было шмат, толькі выконвай. У «Бюро добрых паслуг», напрыклад, студэнты дапамагалі насельніцтву рамантаваць радыёпрыёмнікі, магнітафоны, бытавую тэхніку. А на кансультацыйным пункце праводзілася агітацыйная работа з моладдзю. Байцы расказвалі аб сваім факультэце і аб універсітэце, запрашалі паступаць у БДУ.

«Буравеснік» узяў шэфства над 6 помнікамі героям Вялікай Айчыннай вайны. Каля в. Двесніца знаходзіцца мемарыяльная пліта В. І. Казлову, імя якога з 1974 года носіць атрад. У бліжэйшыя гады на гэтым месцы па ініцыятыве байцоў атрада будзе ўзведзен помнік.

**Некаторыя вынікі.** Да 6 жніўня — дня здачы аб'екта — атрад умацаваў 10 км асушальных каналаў, асвоіў 60 тыс. руб. капіталаўкладанняў — на 20 тыс. руб. звыш нормы. Па выніках трэцяга працоўнага семестра заняў II месца.

Нельга пералічыць усе справы «Буравесніка». Лепш назваць яшчэ некалькі лічбаў. За месяц атрадная агітбрыгада выступіла з 11 канцэртамі, а на інтэрнацыянальным злёце заняла першае месца, як, між іншым, і насценны друк.

**Карысць:** працоўная загартоўка. Але не менш важна і тое, што ў атрадзе склаўся дружны, моцны калектыў. Гэта радуе. Гэта — галоўнае...

**Н. АРЛОЎСКАЯ.**

**Матэрыялы старонкі камсамольскага жыцця арганізавала Н. ЛЕБЕДЗЕВА.**



# Ружовы ранак

літаратурная старонка



## «УЗЛЁТ» ПРЫМАЕ ПАПАЎНЕННЕ

**Сёлетні год, нягледзячы на тое, што ён высакосны, спрыяльны для «Узлёту»: шэраг здольнай паэтычнай моладзі папоўніў наша літаб'яднанне. У ім і студэнты, што прыйшлі вучыцца на філалагічны факультэт, і будучыя журналісты. Вячэрнюю школу рабочай моладзі канчаў у Зельве Гродзенскай вобласці Уладзімір Мазго. З той жа вобласці—з вёскі Берүшты Шчучынскага раёна дачка сельскіх настаўнікаў Вольга Русілка. З падрыхтоўчага аддзялення паступіў Віктар Стрыжак, з Палесся — Мікола Мінзер. З розных іншых мясцін — Алесь Пісарык, Ганна Урублеўская — студэнты філфака, першакурснікі-журналісты Алесь Усеня, Тадэвуш Чарнавус, Леанід Пранчак. Асабліва парадавалі ўзлётаўцаў вершы Уладзіміра Мазго, Алеся Усені, Вольгі Русілкі. Як і ў некаторых іх іншых аднагодкаў, у вершах гэтых маладых паэтаў ёсць подых чагосьці новага, у прадчуванні чаго знаходзіцца сёння ўся наша беларуская савецкая паэзія, якая чакае галасоў новага пакалення, што нарадзілася, вырасла ўжо толькі ў пасляваенны час.**

**І, як заўсёды, прадстаўляючы універсітэцкаму чытачу новыя імёны, мы гаворым: «У добры час! Шчаслівага ўзлёту вам, новае папаўненне ўзлётаўцаў!»**

**Алег ЛОЙКА,**
**кіраўнік літаб'яднання «Узлёт».**

Віктар СТРЫЖАК

### МАГНІТ

Часамі прагну рознага...
(Быць можа, век даўў).
Не разгубіць бы роднага,
Знаёмага здавён.

Хай іншых слепіць рэчамі
Шматпавярховы быт,
А я хачу пад Рэчыцу,
Дзе так даўно не быў.

Даволі жыць на ростанях.
Патупаю наўпрост.
Да разумення простага —
Туды, дзе сам прарос.

Забуду ўсё адмоўнае
Канкрэтнага жыцця,
Каб захмялець ад моманту
З прыродаю зліцця.

Здаюцца недарэчнымі
Па горадзе агні...
Прыцягвае пад Рэчыцу
Мяне сяла магніт.

* * *

**Сцяжынка не асвечана.**
**У мурагоў прыпол**
**Упалі смеласць вечара,**
**Чулліваcці прыбой.**

**Узлёт тваёй няўлоўнасці...**
**П'ю навіну пляча.**
**Вачэй кастры**
**шматслоўныя —**
**Маёй душы прычал.**

**Плыве твая ўзрушанасць**
**Над вечнасцю лугоў,**
**А грудзі пахнуць грушамі**
**І завяззю грахоў...**

Ганна УРУБЛЕЎСКАЯ

### НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ

Прозвішчаў не злічыш
На гранітных плітах,
Многа невядомых,
Але не забытых.

Не прыйсці дадому,
Не пасеяць жыта
Многім невядомым,
Але не забытым.

Надвячоркам ціхім
Сінія пралескі
Пакладзе дзяўчына —
Не яго нявеста.

І чужая маці,
Што чакае сына,
Ціхенька заплача
Разам з той дзяўчынай.

Ў глыбах мармуровых,
Ў вечнасці граніту —
Памяць невядомым,
Але не забытым.



### НАЧНАЯ ПЕСНЯ

**Можа таму, што вавёркай**
**Песня начная блукае,**
**Светлай расой сінявокай**
**Кветка ў бары расцвітае.**

**Жмурыць, блакітная, вочы, —**
**Глянула я, задрыжала...**
**Ты мне сказаць нешта хочаш!..**
**Песня начная сказала!..**

**Кветкі ад краю да краю,**
**Песню і ты чуеш, знаю...**
**Ціхая песня начная,**
**Родная, баравая!..**

Алесь УСЕНЯ

### ПРЫЗНАННЕ

... Раптам у адказ — тваё
маўчанне
І халоднасць здзіўленых вачэй.
Птушкаю падстрэленай каханне
У грудзях трапечацца яшчэ.

У душы нясмелыя сумненні —
Зразумець мяне ты не змагла,
Быццам я ў другія вымярэнні
Вылецеў са скорасцю святла...

* * *

**Закон жыцця: сімпатыю сваю**
**Заўсёды аддаём мы навізне.**
**І чым бліжэй цябе я пазнаю,**
**Тым больш далёкай ты**
**здаешся мне...**



Арк. ЖУРАЎЛЁЎ

## ПАЧАТАК ДНЯ

ЛІРЫЧНЫ ЭЦЮД

Сонца будзіла горад. Спачатку яно вельмі далікатна і асцярожна, рассоўваючы промнямі лёгкія шарэючыя прыцемкі, паказала з-за гарызонта свой ярка-чырвоны край, быццам кінула на зямлю адным вокам, маўляў, ці не рана прачынацца?

Затым паволі выкацілася на ўскраек неба і, лавіруючы між лёгкіх пёрыстых аблокаў, пачало важна, быццам чырванашчокая купчыха, прабірацца ўгару, заліваючы наваколле пяшчотнай ружовасцю. Промні спачатку ляніва, а потым жвавей і жвавей пачалі бударажыць прыціхлыя яшчэ з ночы вуліцы горада. Яны то зазыр-чаць на рэчцы ля нашага інтэрната, то смела завітаюць у шырокія вокны яго, жадаючы студэнтам добрай раніцы, а значыць, і добрага дня, які прынясе нейкую асабістую для кожнага радасць, шчасце, плён працы. Праходзіла хвіліна-другая, і яны ўжо песцілі галінкі тапаляў у гарадскім парку ці гулялі ў схованкі на бляшаных і шыферных дахах, пакідаючы сонечных зайчыкаў на тэлевізійных антэнах і недзе там, на сценах шматпавярховых дамоў.

А тыя, не дачакаўшыся сваіх бацькоў-промняў, крадком садзіліся ў кузавы і на дахі праязджаючых аўтамашын і тралейбусаў і адпраўляліся ў далёкія нялёгкія падарожжы па ўсім горадзе, а мо і далей.

Шэры асфальт здаваўся цяплейшым і больш даверлівым пад лагодным поглядам сонца, і цяпер ужо не такімі пахмурнымі выглядалі старыя будынкі. І наш пакойчык стаў таксама ўтульным і не такім пустым.

Зацяты сонечны прамень саслізнуў з адчыненага акна на стол, на якім ляжала люстэрка, — і рассыпаліся па пакоі зіхатлівыя, жвавыя сонечныя зайчыкі. Яны спрытна скачуць па пакоі, ложку, сцяне, падлозе. Ад іх свавольства на твары паяўляецца ўсмешка.

У горад прыйшла раніца.



Мікола МІНЗЕР

### АСЕННЯЕ

Шчырасцю барвы узрушана
сэрца,
Тлее пяшчота ў вачах,
Свежаю коўдрай лістоты
імкнецца
Верасень выкласці шлях.

Стоена шэпча таполя:
«Шчэ рана».
Тлумна разносіцца пах
Кветкі асенняй, няўдала
сарванай,
Верасу ў сціхшых лясах.

Бавіцца погляд у шэрасці
неба,
Кліча адлёт журавлёў,
Вецер даносіць пах свежага
хлеба
У кропельках вялых
дажджоў.

Уладзімір МАЗГО

* * *

Акрыяю
Водарам бароў
Пасля пыльных стогалосых
вуліц.
Акрыяю ласкаю сяброў
Пасля крыўды, што мяне
атуліць.
Промнем акрыяю маладым
Пасля доўгай цёмнатварай
ночы.
Акрыяю першым крокам,
Тым,
Што наперад зроблен,
А не збочан...
Часам сцежка ўдалеч
павядзе, —
Апынуся у няблізкім краі,
Сярод незнаёмых мне
людзей—
Думкай аб Радзіме —
Акрыяю.

**Лістоты барвовай касынка**
**Апала на рукі бяроз.**
**Не вечны ні восень,**
**Ні лета.**
**Дык што нас сюды занясло!**
**Датлее аднойчы каметай**
**Сузор'е купалаўскіх слоў!..**

**Ніколі!..**
**Стагоддзі бруіцца**
**Іх звонкай крыніцы зямной.**
**...За гонар лічу**
**Прычасціцца**
**Спрадвечнай яе глыбінёй.**

### РОЗДУМ У ВЯЗЫНЦЫ

**Вязынка, Вязынка, Вязынка.**
**Тут колісь Купала ўзрос...**

### ПЕРШААДКРЫЦЦЁ

Пах прагорклы палыну
І смуга надрэчча.
Яблык поўні
Праглынуў
Цёмнатвары вечар.
Як зярняты,
Верабей
У люстранай лужы
Зоркі спелыя дзяўбе,
Толькі — не адужыць.

Вольга РУСІЛКА

### БЕЛЫ КОЛЕР

Белы колер... Ды ён
непрактычны!..
Не схаваеш і плямкі бруду!..
Колер вэлюмаў, колер звычны,
Ані кроплі на ім пасуду!..
Вось таму і дзяўчаты, як вішні,
І чаруюць, бялюткія, маем!..
Белы колер?.. Ён самы
практычны,
Бо ні плямкі на ім не схаваеш!..

### ЗІМА

**Сіпеннем завеі наскрозь**
**працяло:**
**«Зі-і...»,—і мароз па целе!..**
**«...ма!» — і халадоў нібы не**
**было:**
**Свет мамінай ласкай цяплее.**



Восень. Фота А. ШАРАВА.

Алесь ПІСАРЫК

### БАЦЬКА

Палі пустыя, скошана атава,
І бацька пляц паспеў
перааараць:
Зірнуў налева, паглядзеў
направа,
Ці ўсё паспеў к зіме
падрыхтаваць.

Здаецца, што закончаны
работы.
Ды бацька не ідзе ўсё са
двара:
Мацуе жэрдку новую да плоту,
Не выпускае з рук ён тапара.

То дрэўцы ад зайцоў ільном
абвяжа,
То з дымаром заглядвае ў
вуллі,—
Сваё жыццё з пчалінным бацька
вяжа,
Як бацька-гаспадар сваёй
зямлі.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5 друк. ар. АТ 04593 Заказ № 1770.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.